Абласны конкурс
работ даследчага характару (канферэнцыя)
навучэнцаў установы агульнай сярэдняй адукацыі
па вучэбным прадмеце
“Беларуская літаратура”

# Чарадзейства славянскай лялькі

Аўтар:
Раманоўская Уладзіслава Яўгеньеўна,
вучаніца 7 класа

Асіповічы, 2017

ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| Уводзіны | 3 |
| 1 Гісторыя ўзнікнення традыцыйнай народнай лялькі | 5 |
| 1.1 Што абазначае слова “лялька”? | 5 |
| 1.2 Як з’явілася лялька? | 5 |
| 1.3 Гісторыя традыцыйнай народнай лялькі | 6 |
| 2 Класіфікацыя народных лялек па прызначэнні | 8 |
| 2.1 Абрадавыя лялькі | 8 |
| 2.2 Лялькі-абярэгі | 10 |
| 2.3 Гульнёвыя лялькі | 12 |
| 2.4 Тэатральныя лялькі | 12 |
| 3 Методыка даследавання | 13 |
| 3.1 Сацыялагічнае апытванне сярод равеснікаў | 13 |
| 3.2 Лялька ў нашай сям’і | 14 |
| 3.3 Наведванне раённага Цэнтра рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва г. Асіповічы | 15 |
| 3.4 Сустрэча з цікавымі людзьмі | 15 |
| 3.5 Наведванне школьнага лялечнага тэатра | 15 |
| 3.6 Наведванне вёскі Дражня Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці | 16 |
| 3.7 Параўнанне традыцыйнай народнай лялькі з сучаснай лялькай | 17 |
| 3.8 Тэхналогія вырабу тканевай народнай лялькі | 18 |
| Заключэнне | 20 |
| Літаратура | 22 |
| Дадаткі | |

# УВОДЗІНЫ

«Хто ў лялькі не гуляў, той шчасця не бачыў» - так гаворыць народная мудрасць. У лялькі дзеці гулялі раней, гуляюць сёння і будуць гуляць заўсёды. Пра лялькy можна клапаціцца,любіць, пелянаць, закалыхваць,упрыгожваць. Яна можа стаць сяброўкай, сястрой, дачкой.

Мяркую, што няма ніводнай дзяўчынкі, якая не любіла б гуляць ў лялькі. Я таксама люблю гуляць у лялькі, і мне захацелася даведацца, якія лялькі былі ў маёй маці,бабулі, параўнаць сучасныя лялькі з лялькамі мінулага часу.

У час экспедыцыі ў вёску Дражня Асіповіцкага раёна ў 2015 годзе ў размове з мясцовымі жыхарамі мы даведаліся,што ў дзяцінстве нашы суразмоўцы гулялі з тканевымі лялькамі і нават помняць, як яны выглядалі. Мы патэлефанавалі ў вёску і дамовіліся яшчэ раз сустрэцца і ўзяць майстар-клас па вырабе тканевай лялькі.

Сапраўды, у нашых продкаў не было ў дзяцінстве столькі цацак, колькі ў сучасных дзяцей. Але іх цацкі былі асаблівыя, чароўныя, зробленыя матулінымі, бабулінымі рукамі з натуральных матэрыялаў: тканіны, дрэва, травы, саломы, нітак. Самаробныя цацкі беражна захоўваліся ў сям’і, перадаваліся з пакалення ў пакаленне разам з традыцыйнымі прыёмамі іх вырабу.

Выбраная тэма здаецца мне цікавай таму, што лялька – самая старажытная і найбольш папулярная цацка. Лялькі – нашы блізкія сябры. Дзякуючы ім, мы становімся чулымі, беражлівымі, добрымі, у нас развіваецца густ, фантазія, закладваюцца першыя навыкі шыцця. Любімай цацкай становіцца тая, якая зроблена сваімі рукамі.

Я вельмі люблю лялькі ручной працы і вучуся рабіць іх сама з дапамогай мамы. Бо калі ўкласці ў іх працу, намаганні, цярпенне і цяпло, лялькі атрымліваюцца “жывымі” і праслужаць доўгі час.

Галіна Дайн у сваёй кнізе “Тряпичная кукла. Лоскутные мячики” указвае, што “лялька - знак чалавека, яго гульнёвы вобраз-сімвал”. У гэтай ролі яна факусіруе час, гісторыю культуры і народа, адлюстроўваючы іх рух і развіццё.

Тканевая лялька гаворыць ёмістай мовай пластыкі, жыве ў прасторы разам з намі. Яшчэ ў пачатку ХХ стагоддзя амаль у кожнай сям'і ў вёсцы і ў горадзе дзеці гулялі з тканевымі лялькамі. І толькі з 1960-х гадоў, калі прамысловыя прадпрыемствы пачалі выпускаць цацкі з пластмасы, традыцыі вырабу дамашняй лялькі амаль згаслі. Аднак не знікла зусім, глыбока адклаўшыся ў народнай памяці. Да гэтай жыватворнай крыніцы духоўнасці і звяртаюцца тыя, хто вывучае народную культуру, хто імкнецца данесці да нашчадкаў каштоўныя яе драбніцы [1].

Знаёмства з традыцыйнымі народнымі лялькамі дазваляе пазнаёміцца з некаторымі старонкамі народнай культуры. Менавіта лялькі могуць расказаць пра жыццё нашых продкаў, іх культуру і традыцыі.

**Гіпотэза**: натрадыцыйную народную ляльку не ўплывае час, і яна па-ранейшаму знаходзіць свой шлях да сэрцаў дзяцей.

Мэта даследавання: абудзіць цікаўнасць дзяцей да традыцыйных народных лялек і іх вырабу ўласнымі рукамі. Параўнаць традыцыйную народную ляльку з сучаснай лялькай.

**Задачы даследавання:**

1. Вывучэнне навукова-папулярнай літаратуры і інтэрнэт-рэсурсаў па тэме даследавання.

2. Правядзенне сацыялагічнага апытвання:

а) сярод дзяўчынак 7 “А” і 9 “А” класаў з мэтай высвятлення, у якія цацкі гуляюць мае аднагодкі і што ім вядома пра традыцыйныя народныя лялькі;

б) сярод бабуль вёскі Дражня Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці з мэтай высвятлення, якія лялькі і як яны выраблялі сваім дзецям.

3. Знаёмства з гісторыяй узнікнення народнай лялькі.

4. Вывучэнне класіфікацыі народных лялек па прызначэнні.

5. Параўнанне традыцыйнай народнай лялькі з сучаснай лялькай.

6. Выраб традыцыйнай народнай лялькі.

Метады даследавання: аналіз літаратуры, анкеціраванне навучэнцаў, апытванне мам і бабуль, апрацоўка атрыманых дадзеных, аналіз, параўнанне і абагульненне атрыманых вынікаў.

## 1 Гісторыя ўзнікнення традыцыйнай народнай лялькі

### 1.1 Што абазначае слова “лялька”?

Пачынаючы сваю даследчую работу, я задала сабе пытанне: што такое лялька? Для гэтага я звярнулася да тлумачальнага слоўніка. У тлумачальным слоўніку беларускай мовы тлумачыцца, што лялька – дзіцячая цацка ў выглядзе фігуркі чалавека, а таксама макет фігуры чалавека ці жывёлы для тэатральных прадстаўленняў. На думку другіх вучоных, гэта любая фігурка чалавека, нават калі яна не з’яўляецца дзіцячай цацкай [8].

Са старажытных часоў лялька была традыцыйнай цацкай беларусаў. Яна суправаджала чалавека ад нараджэння да смерці, забаўляла, вучыла, аберагала, з’яўлялася неад’емным атрыбутам любых святаў.

### 1.2 Як з’явілася лялька?

Існуюць міфы ілегенды пра з’яўленне лялькі. Калі верыць міфам, лялька з’явілася нават раней,чым чалавек. Міфы пра тое, як багі з розных матэрыялаў рабілі лялькі, а тыя ператварыліся ў людзей, сустракаюцца ў японцаў, кітайцаў, індзійцаў.

У музеях свету захоўваецца мноства фігурак, выкананых з гліны, каменя, з касцей яшчэ ў каменным стагоддзі. Гэта папярэднікі лялек-цацак: ідалы, куміры, божаствы. У Брытанскім музеі захоўваецца тканевая лялька, якая належала маленькаму рымленіну,які жыў за 300 гадоў да нашай эры. Самая старажытная лялька знойдзена ў егіпецкай грабніцы. Зробленая з драўляных дошчачак і пакрытая геаметрычнымі малюнкамі, якія азначалі адзенне, з “валасамі” з гліняных караляў, яна 4 тысячы гадоў назад суправаджала ў апошні шлях свайго маленькага гаспадара – фараона. Цацкі, якія ўжывалі дзеці простага народа, нешматлікія. Для гульні служылі драўляныя фарбаваныя яйкі,

лыжкі, камні і інш. Рабілі цацкі і з попелу, гліны, косці, дрэва, саломы, нітак і ў большасці з паркалю. Аднак усе народныя лялькі былі падобны ў адным: у іх не было твару, проста белы лапік тканіны без абазначэння вачэй, носа, рота, вушэй.

### 1.3 Гісторыя традыцыйнай народнай лялькі

На тэрыторыі Беларусі лялька вядома з дахрысціянскіх часоў. А так, як вядома, беларуская лялька адносіцца да славянскіх лялек, то яе гісторыя цесна звязана з гісторыяй рускай лялькі. А пагэтаму можна сцвярджаць: традыцыйная народная лялька з'явілася больш за 1000 гадоў назад. На Русі было павер'е: калі вырабіць такую ляльку для сям'і, то яна здольна абараняць і ахоўваць усіх членаў сям'і. Спачатку ў народнай лялькі было прызначэнне аберагаць сям'ю,а крыху пазней вясковыя дзяўчынкі пачалі гуляць з гэтымі лялькамі. Праз ляльку дзеці знаёміліся з ладам жыцця, набывалі касмаганічныя, маральныя, сімвалічныя, міфалагічныя веды [4].

Традыцыйнай цацкай у побыце вёскі з даўніх часоў была тканевая лялька. Лялькі былі не толькі забавай для дзяўчынак. Гулялі з лялькай да 7-8 гадоў усе дзеці, пакуль хадзілі ў кашулях. Як толькі хлопчыкі пачыналі насіць штаны,а дзяўчынкі – спадніцы, іх гульнёвыя ролі раздзяляліся.Пакуль дзеці былі маленькія, лялек шылі маці, бабулі, старэйшыя сёстры. Тканевая лялька – прасцейшае адлюстраванне жаночай фігуры. Па звычаі тканевыя абрадавыя лялькі выраблялі жанчыны: у народных вераваннях жанчына з'яўляецца заступніцай лёсу, шлюбу, урадлівасці, дамашняга ачага. Са старажытных часоў жанчыны захоўвалі і перадавалі веды і навыкізпакалення ў пакаленне.

Лялькі выраблялiся безаблічнымі з суцэльных кавалкаў зношанага адзення. Адсутнасць твару было знакам таго, што лялька – рэч неадушаўлёная, а значыць, ніхто не прычыніць жывому чалавеку зло праз такую ляльку. Ношаная тканіна сімвалізавала энергію, жыццёвую сілу чалавека. Тканіну і ніці рвалі ўручную. Лялькі выраблялі без нажніц і іголак, каб будучае жыццё было "не рэзанае, не колатае". Лічылася, што лялька-абярэг, вырабленая пры дапамозе іголкі, не будзе ахоўваць чалавека, а, наадварот, можа яго параніць, як

вострая іголка. Каб надзяліць ляльку магічнай сілай, пры яе вырабе чыталі загавор, які іншы раз трэба было прачытаць да канца, ні разу не збіўшыся, на працягу яе вырабу. Некаторыя лялькі жанчыны рабілі маўчком, прагаворваючы загавор “сам сабе”. Ляльку выраблялі “адным захадам”, ніколі не пакідаючы недаробкі на потым.

У традыцыйных народных лялек была адна агульная асаблівасць – адсутнасць твару. Лічылася, што, калі намаляваць ляльцы твар, у яе можа ўсяліцца “злы дух” ці могуць праз такую ляльку нанесці чары. Лялька ў доме адыгрывала ролю абярэгу: адцягнуць на сябе злыя сілы.

Яшчэ ў XIX стагоддзі ў славянскіх народаў лічылася: ляльку нельга пакідаць у хаце дзе папала. Ёй адводзілі спецыяльнае патаемнае месца, хавалі ў сундук, клалі ў пасаг. Лялькі, якія прызначаліся для аховы ад цёмных сілаў, сварак,хвароб, ставілі ў хаце ў чырвоны кут. У кожнай сям’і захоўвалася многа лялек, таму што выкінуць старую ляльку, а тым больш папсаваць яе, зламаць ці спаліць было вялікім грахом. Яны так і пераходзілі ад адной дзяўчынкі да другой, бо сялянскія сем’і ў той час былі шматдзетныя. Лічылася, каб стаць добрай маці, трэба гуляць у лялькі.

Да цацак, лялек дзеці адносіліся вельмі беражліва. Створаныя рукамі самых родных людзей, яны захоўвалі ў сабе іх любоў, клопат, мудрасць. А бацькоўскую любоў нельга зневажаць. Дзеці адчувалі гэта, таму ніколі не астаўлялі цацкі на вуліцы, не раскідвалі па хаце, а берaглі, захоўвалі ў карзінах, замыкалі ў сундуках. Лялек дазвалялася браць у госці, іх клалі ў пасаг.

Мы знайшлі некалькі выказванняў знакамітых людзей, а таксама некалькі прыказак з рускай мовы (у беларускай мове не знайшлі) пра ляльку, якія гавораць пра тую вялікую ролю гэтай цацкі ў жыцці чалавека. Напыклад: “Хто ў лялькі не гуляў, той шчасця не бачыў”, “З лялькамі гуляць – жыццю вучыцца”, “Маленькая дзяўчынка без лялькі нешчаслівая, і яе немагчыма ўявіць без лялькі, як жанчыну без дзяцей” (В.Гюго), “Як птушкі з усяго будуюць гнёзды, так дзеці з усяго майструюць ляльку” (В.Гюго), “Страталялькі ў дзіцяці і кароны ў караля – падзеі аднолькавай велічыні” (М.Твен).

## 2 Класіфікацыя лялек па прызначэнні

У лялечных забавах праходзілі амаль усевясковыя святочныя абрады. Дзеці вельмі сур’ёзна адносіліся да гульні, захоўваючы паслядоўнасць абраду, запамінаючы і паўтараючы размовы дарослых, абрадавыя песні, якія яны выконвалі. Па сваім прызначэнні традыцыйныя лялькі падзяляюцца на абрадавыя, лялькі-абярэгі, гульнёвыя, тэатральныя.

### 2.1 Абрадавыя лялькі

Раней да любога свята ў сям’і майстравалі ляльку, у якую ўкладвалі часцінку душы. Абрадавых лялек ушаноўвалі і ставілі ў хаце ў чырвоны кут. Каляндарна-абрадавыя лялькі прызначаліся для ахвярапрынашэння розным багам. Напрыклад, лічылася, што перыяд святак – гэта час разгулу нячыстай сілы. Таму ў гэты час выраблялiся ачышчальныя лялькі, якія ўбіралі ў сябе негатыўнае: Меланку, Каляду, Масленіцу. Рабілі іх у выглядзе чучала з саломы і падручных матэрыялаў. З гэтымі лялькамі ўдзельнікі абраду абходзілі вёску, наладжвалі хараводы і гульні. Пасля іх “хавалі”, спальвалі на вогнішчы, а ў замен прасілі дабрабыту, здароўя, добрых ураджаяў. Пераход да веснавога цыклу азначаліабрадавыя лялькі Зязюля, Русалка, Купаўка, Купала. Рабілі іх апранутымі ў паркалёвае адзенне. Пасля свята лялек “аддавалі” багам – раскідвалі па палях, тапілі ў вадзе, сплаўлялі па рацэ, спадзеючыся, што яны забяруць хваробы і нягоды і прынясуць шчасце, каханне. Мноства магічных дзеянняў прыстасавана да ўборкі ўраджаю: тады выраблялiся Зярнушкі, Крупенічкі [2].

Абрадавыя лялькі былі неадлучным атрыбутам асноўных сямейных падзей (вяселле, нараджэнне, адыход да продкаў). У якасці падарунка маладым дарылі ляльку “Багацце, ураджайнасць”, якая ўяўляла сабой кампазіцыю: да тулава асноўнай лялькі-маці поясам прывязана мноства дзетак (вялікая колькасць дзяцей вядзе да росквіту роду, а значыць, у доме, дзе многа работнікаў, будзе дастатак). Гэту ляльку трымалі ў доме дзе-небудзь вышэй, недаючы ў рукі нікому чужому. Пры нараджэнні дзіцяці прымянялі Пелянашку ці Стаўбушку: дзіця адразу пасля нараджэння хавалі з маці ў хляве ці каморы.

Муж, пераапрануты ў сукенку жонкі, займаў яе месца ў ложку. Да мужа падкладвалі спелянаную ляльку. Лічылася, што так можна адвесці небяспеку ад дзіцяці.

А зараз я паспрабую апісаць некалькі абрадавых лялек.

**Багатуха**. Гэтую ляльку пладавітасці, росквіту, памнажэння і пабагачэння роду заўсёды стварала маці. І выглядала лялька як шматкампанентная кампазыцыя: да асноўнай, большай, постаці прывязваюць паясам маленькіх лялек-дзетак. Часцей ляльку дарылі на вяселле: падчас вясельнай цырымоніі маці адрывала маленькіх лялек ад вялікай і перадавала маладым – на прыплод, зачын здаровых нашчадкаў і дабрабыт. Вялікая лялька



заставалася ў бацькоўскай хаце як сімвал моцы роду. Яе ставілі высока на шафу ці паліцу і ніколі не давалі ў рукі чужакам. Багатуху не знішчалі, пакуль доўжыўся род.

**Стаўбушка**. Гэтую ляльку таксама наўмысна рабілі да вяселля з лялькамі-дзеткамі – на прыплод. Лялька вядомая з паганскіх часоў і здаўна выконвала ролю заклікання ў хату сватоў (як і лялька Капустка, на якую апраналі мноства яркіх шматколерных спаднічак,якой рабілівя лікія грудзі, а затым давалі



разглядаць юнаку, каб вызнаць ягоныя зацікаўленн і іншым полам).



**Зернявушка**. Ляльку робяць увосень з новага ўраджаю (тулава – клуначак з зернем), а разбіраюць на фрагменты ўвесну, засяваючы зернем з яе першую раллю. Ствараюць абавязкова сваімі рукамі, не дораць і не прымаюць як дар. Сімвал заможжа, дабрабыту, ладу. Ставяць на покуці пад абразамі. А таму Зернявушку адносяць да лялек абярожных. Гэткую ж місію выконвае і лялька Крупенічка, аснову якой таксама складае клуначак з якім-небудзь зернем.

**Берагіня**. Яна дапамагае ў гаспадаранні, засцерагае ад хвароб, бароніць і ахоўвае, спрыяе ў вырашэнні нейкіх праблем і канфліктаў, мацуе мацярынства.





**Масленіца**. Ляльку рабілі з саломы ці лыка, абавязкова выкарыстоўвалі і тонкі ствол бярозы. Салома, як і бяроза ўвасабляла буйную сілу расліннасці. Адзенне на ляльцы ўпрыгожвалася раслінным арнаментам. Фігурку замацоўвалі на крыжавіне з дрэва, упрыгожвалі лентамі. У рукі ёй іншы раз давалі посуд, які выкарыстоўваўся пры выпечцы бліноў, а таксама вешалі тасму, завязваючы якую можна было загадваць жаданне. Каб жаданне збылося тасма павінна была згарэць разам з лялькай.

**Марцінічкі**. Гэтыя лялькі з’яўляліся атрыбутам абраду “Гуканне вясны”, удзельнікамі якога ў асноўным былі моладзь і дзеці. Лялек вязалі парамі: з белых нітак – сімвал адыходзячай зімы і чырвоных - сімвал спякотнага лета. Лялечныя пары развешвалі на галінках дрэў.



**Лялька Неразлучнікі** – сімвал і абярэг моцнага сямейнага саюзу, пагэтаму робіцца як бы на адной руцэ, каб муж і жонка ішлі па жыцці поплеч, былі разам і ў радасці і ў горы. У сучасны час традыцыя захавалася. Цяпер, як і



і шмат гадоў назад, можна зрабіць гэтую лялльку самім і падарыць новай сям’і ад шчырага сэрца з пажаданнямі ніколі не разлучацца. Пасля вяселля гэта лялька захоўвалася ў доме як абярэг сямейных адносін і вернасці.

**2.2 Лялькі-абярэгі**

Лялькі-абярэгі (ці ахоўныя) у крызісныя часіны, калі была асабліва патрэбна іх падмога, тройчы паварочвалі супраць гадзіннікавай стрэлкі, прамаўляючы засцярожную формулу: “Адкруціся злом, павярніся дабром!”.



**Кувадка**. Лялькy, як і Спавівачку-Пелянашку, рабілі з адзення маці дзеля дзіцяці, што павінна зявіцца ў сям'і, і за два тыдні да яго нараджэння падкладалі ў ложачак – каб сагрэла пасцельку. Кувадку вешалі над ложкам дзіцяці. Лялька аберагала дзіця ад сурокаў да Хрысцін, потым ператваралася ў гульнёвую, а затым, калі не распадалася, яе захоўвалі разам з хрышчальнай кашуляй.



**Ліхаманкі** (Трасавіцы) — падвешаныя на адной вяровачцы каля коміну, праз які яны із'яўляюцца з іншасвету, 13 лялек (кожная са сваім імем). Трымаючы такую лялькавую абарону, гаспадары ўпэўнены, што злосныя духі заселяцца ў лялек, а не ў сямейнікаў. Праз год абярэг спальвалі, выманьваючы з хаты ўсе хваробы.

**Берагіня**. Лялька спрыяе жанчыне, якая ўжо склала свой лёс, падгадавала дзяцей і набыла статус абярожніцы ўсяго роду, усіх повязяў у сваёй радзіне і ў сваім доме

**Суцешніца**. Лялькy робяць абавязкова з матчынага падолу і захоўваюць у хаце да тае пары, пакуль яна не зносіцца ўшчэнт і не распадзецца на першаэлемнты. Змалку дзіця звыкаецца, што ўсе крыўды і свавольствы можна пераказаць адмысловай ляльцы, і яна пашкадуе і падможа. Суцешніцу часам дзяўчына пасля вяселля, пераяжджаючы ў дом мужа, брала з сабой – дзеля лягчэйшай адаптацыі ў новых умовах.



**Лялька-Падарожніца**. Маленькая, здольная схавацца ў далоні, з клуначкам зерня ў руках, лялька “высцілае” шчаслівую дарогу і зберагае гаспадара далёка ад дому.



**Лялькі-званаркі.** Абярэгі хаты ад злосных духаў, нягод і згуб. Стваральніцы святла і радасці і прывабніцы ў дом добрых вестак, Званаркі яшчэ адганяюць хваробы. Некалі гэтыя цацкі абавязкова прывязвалі да дугі ва ўсіх святочных запрэжках.

**2.3 Гульнёвыя лялькі**

Гульнёвыя лялькі прызначаліся для забавы дзецям. Яны маглі быць сшытымі і спавітымі.Спавітыя лялькі выраблялiся без выкарыстання іголкі: на драўляную палачку тоўстым слоем накручвалі тканіну, перавязвалі вяроўкай, затым прывязвалі галаву, ручкі, ножкі і апраналі ў святочнае адзенне. Такія лялькі маглі рабіць самі дзеці. У падарунак на дзень нараджэння рабілі лялек Анёльчыкаў. Лялька выраблялася со светлых кавалачкаў тканіны. Лялька Палена - гэта лялька, прыбраная ў жаночае адзенне. У якасці тулава мог выкарыстоўвацца кавалак тканіны, скручаны валком. Вяршыню паленца абцягвалі светлай льняной тканінай – атрымліваўся твар.Упрыгожвалі ляльку кудзельнай або валасяной касой. З такой лялькай дзеці гулялі з задавальненнем. Дзецям з трох гадоў у якасці сябра і субяседніка выраблялі ляльку “Зайчык на пальчык”. Калі бацькі ішлі з дому, яны надзявалі дзіцяці на пальчык гэтую ляльку, з якой дзіця магло і пагуляць, і пагаварыць, калі станавілася сумна ці страшна. Сярод любімых лялек дванаццацігадовых дзяўчынак была лялька “На выхвалку”. Яна з’яўлялася своеасаблівым экзаменам па шыццю і рукадзеллю. Вырабляючы такую ляльку, дзяўчынкі авалодвалі мастацтвам рукадзелля.

**2.4 Тэатральныя лялькі**

З XIV стагоддзя вядомы народны лялечны тэатр батлейка**,** у якім



выкарыстоўваліся расфарбаваныя драўляныя ці ў адзенні з абрэзкаў тканін лялькі, умацаваныя на драўляным ці металічным шпяні. У ценевым тэатры (жлоб) выкарыстоўваліся выразаныя з бляхі ці кардону Лялькі,



сілуэты якіх праецыраваліся на спецыяльны экран. У XVIII стагоддзі шляхта (Агінскія ў Слоніме, Радзівілы ў Нясвіжы) наладжвалі лялечныя прадстаўленні з выкарыстаннем лялек-марыянетак, якія кіраваліся зверху металічным штыром, умацаваным у драўлянай галаве лялькі. Больш шырокі дыяпазон рухаў

ствараюць трысцінавыя лялькі, якімі кіравалі пры дапамозе трысцін (звычайна з дроту), прымацаванымі да кісцяў рук. Сучасны тэатр лялек выкарыстоўвые марыянеткі, кіруемыя зверху з дапамогаю нітак.

## 3 Методыка даследавання

### 3.1 Сацыялагічнае апытванне сярод равеснікаў

Я вырашыла правесці сацыялагічнае апытванне сярод сваіх равеснікаў і выявіць, зякімі цацкамі яны гуляюць і што яны ведаюць пра традыцыйную народную ляльку. Было апытана 47 вучняў 7 "А" і 9 "А" класаў ДУА "Сярэдняя школа №3 г. Асіповічы". Ім было прапанавана адказаць на наступныя пытанні:

1. Якія цацкі ў цябе ёсць?
2. Якія з іх ты любіш больш за ўсё?
3. Ці любіш ты цацкі, зробленыя сваімі рукамі?
4. Якія народныя лялькі ты ведаеш?
5. Ці жадаеш ты займацца вырабам народнай тканевай лялькі (на гэта пытанне адказвалі дзяўчаты)?

У час апытвання выявілася, што амаль ўсе дзеці маюць цацкі (39 вучняў), любімыя цацкі маюць (19 вучняў) – гэта ў асноўным мяккая цацка, 21 вучань адказаў, што любіць самаробныя цацкі, да народных лялек аднеслі саламяную ляльку (4), матрошку (9), лялькі-абярэгі (4), 13 дзяўчынак пажадалі вырабляць тканевую ляльку, на жаль, з іх толькі дзве дзевяцікласніцы.




Вывад: мае равесніцы ведаюць і любяць гуляць з сучаснымі лялькамі: Барбі, Моксі, Вінкс, Монстрамі, Тэдзі і інш. Дзяўчынкам падабаецца вырабляць

і гуляць з цацкамі, зробленымі сваімі рукамі, але пра народную ляльку (як бачна вышэй) ведаюць нямногія. Яны не маюць уяўлення, што з падручнага матэрыялу можна самім зрабіць іх. Калі б яны самі выраблялі такіх лялек, у якіх уклалі сваю душу і стараннне, то для іх яны сталі б сапраўднай любімай цацкай.

**3.2 Лялька ў нашай сям'і**

Выраб лялек – захапленне, перад якім немагчыма ўстаяць, хобі, якое для многіх становіцца прафесіяй.

Гісторыя вырабу лялек у нашай сям'і ўзнікла даўно. Мая бабуля ўспамінае, што ў яе дзяцінстве лялек выраблялі самі. У вольны час бабуля шыла лялек для маёй маці. Ёй вельмі хацелася, каб у яе дачкі (маёй маці) былі разнастайныя лялькі, у тым ліку і тканевыя самаробныя. Бабуля вельмі добра вязала і ўсіх лялек апранала ў вязаныя мініяцюрныя рэчы. Творчыя задаткі перадаліся маёй маці ў спадчыну. Калі маці была школьніцай, яна наведвала гурткі рукадзелля. На гэтым яе захапленні не закончыліся. Калі маці вучылася ў педагагічным каледжы, займалася дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, якое стала яе другой спецыялізацыяй. З часам творчасць стала не толькі захапленнем у жыцці маёй маці, але і яе прафесіяй.

Аднойчы маці зацікавіла незвычайная тканевая лялька. Вельмі абаяльная і мілая інтэр'ерная цацка з недарэчнымі прапорцыямі і прыгожымі ўборамі. Гэта была тканевая лялька Цільда. Маці захапілася, а я дапамагала ёй ствараць вобразы. "Садовую фею" мы з маці шылі разам.

Мая маці працуе педагогам дадатковай адукацыі, і ў сваёй дзейнасці ёй прыйшлося заняцца вырабам лялек. Але гэта ўжо была народная тканевая лялька – абярэг. Удзельнічаючы ў праекце, мая маці асвоіла выраб такіх лялек. Мяне таксама захапіў гэты занятак. З вялікай цікавасцю явучуся і дапамагаю маці ў вырабе лялек. Раней мне здавалася, што я не змагу засвоіць тэхніку пашыву тканевай лялькі, але гэта акзалася не так складана. Навучыцца асновам майстэрства няцяжка: існуе мноства спецыялізіраваных сайтаў, а для дасягнення поспехаў зусім не абавязкова мець адносіны да творчай прафесіі. Усе матэрыялы для вырабу лялек можна зараз купіць, а для стварэння шэдэўраў

падыходзяць умовы звычайных кватэр. А мне ў рэалізацыі творчых задаткаў дапамагае мая маці-рукадзельніца (Дадатак А).

**3.3 Наведванне раённага Цэнтра рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва г. Асіповічы**

Наступным этапам нашага пректа былі сустрэчы з людзьмі, якія звязаны з вырабам тканевай лялькі. Мы звярнуліся ў раённы Цэнтр народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва г. Асіповічы, дзе Прасаловіч Валянціна Васільеўна займаецца вырабам тканевай лялькі. Валянціна Васільеўна пазнаёміла нас з калекцыяй сваіх лялек, расказала пра складанасць гэтага працэсу, у асноўным гэта валеная лялька, гульнёвая, але вялікую цікавасць выклікае адзенне, у якое апранута лялька. Яно вытрымана ў нацыянальных традыцыях. І гэта, я лічу, вельмі важна сёння. Зацікавіла нас калекцыя абярэгавых лялек, якія таксама зрабіла Валянціна Васільеўна (Дадатак Б).

**3.4 Сустрэча з цікавымі людзьмі**

Мы сустрэліся з Гоман Аленай Вячаславаўнай, якая таксама займаецца вырабам тканевай лялькі. Мы пацікавіліся, чаму яна пачала займацца гэтай незвычайнай справай. Жанчына цяжка захварэла, зацікавілася і пачала вырабляць ляльку. Гэта дапамагала ёй адцягнуць увагу ад цяжкіх думак, падымала настрой, а самае галоўнае, прыносіла вялікае задавальненне і спакой. Мы былі ў захапленні ад яе работы. Алена Вячаславаўна – прафесійная швачка, што вельмі дапамагае ў працы. Лялькі Алены Вячаславаўны выклікаюць цікавасць ва ўсіх, хто бачыць іх, і жанчына часта дорыць іх сваім родным і блізкім. Мне здаецца мець такую ляльку хацеў бы кожны (Дадатак В).

**3.5 Наведванне школьнага лялечнага тэатра**

У нашай школе пры інфармацыйна-бібліятэчным цэнтры дзейнічае лялечны тэатр. Пагэтаму мы вырашылі завітаць да іх і даведацца пра лялькі, якія выкарыстоўваюцца пры пастаноўках лялечных спектакляў. Загадчыца бібліятэкі Волкава Ірына Валер’еўна растлумачыла, што яны ў асноўным выкарыстоўваюць гатовыя камплекты лялек. Але пачалі займацца вырабам

самаробнай лялькі, якую выкарыстоўваюць у пастаноўках-мініяцюрах. Ірына Валер’еўна дала нам майстар-клас вырабу тэатральнай лялькі (Дадатак Г).

### 3.6 Наведванне вёскі Дражня Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці

У пачатку сваёй работы я адзначала, што ў адной з этнаграфічных экспедыцый у вёску Дражня Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў час гутаркі з са старажыламі вёскі, Кавалёва Ядвіга Уладзіміраўна расказвала, што у канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя ў час вялікай засухі ў вёсцы быў хросны ход. Усе жыхары вёскі ішлі з аднаго каца вёскі ў другі, у руках неслі ваду, якую потым вылівалі на перакрыжаванне, а дзеці ішлі з цацкамі. І ў яе руках была самаробная тканевая лялька.

У час працы над праектам мы звязаліся (патэлефанавалі) з Ядвігай Уладзіміраўнай і папрасілі расказаць ці паказаць нам, як выраблялася яе самаробная тканевая лялька. Жанчына нам толькі расказала, як выглядала гэтая лялька. Рабілі яе з панчохі, набівалі ватай, якую бралі са старога адзення. Вочы, нос, рот выразалі з каляровай тканіны і прышывалі да твару. Валасы рабілі звычайна з кудзелі, пянькі ці з суквеццяў кукурузы. Рукі і ногі выраблялі асобна і потым прышывалі да лялькі.

Мы пацікавіліся, да каго з жыхароў вёскі можна звярнуцца, каб даведацца яшчэ што-небудзь пра тканевую ляльку, з якой гулялі вясковыя дзеці. Нам прапанавалі звярнуцца да Касмынінай Алены Канстанцінаўны.

Алена Канстанцінаўна расказала, што ў іх сям’м было тры дзяўчынкі. І бацькі не маглі дазволіць сабе купіць тры лялькі для сваіх дзяцей. Ды і ў вясковых крамах іх не было. Маці вельмі добра шыла, майстравала, і яна зрабіла сваім дзяўчынкам самаробныя лялькі. Алена Канстанцінаўна ўспамінае, што лялькі былі без твару, зробленыя са старога адзення, упрыгожаныя рознакаляровымі абрэзкамі тканіны. Дзяўчынкі з вялікім задавальненнем гулялі ў такія лялькі, пеляналі іх, калыхалі, насілі на руках, будавалі для іх дамы, варылі ежу, кармілі, хадзілі адзін да аднаго ў госці. Тканевая лялька была самай распаўсюджанай сярод вясковых дзяўчынак. Алена Канстанцінаўна

паспрабавала вырабіць (па ўспамінах) лялькі свайго дзяцінства і дала нам майстар-клас, як рабіць ляльку “Пелянашку”. Гэта самая простая лялька. Для выканання работы неабходна два кавалкі тканіны (белай і каляровай), трохвугольны абрэзак з каляровай тканіны для хустачкі, тонкая тасма, ніткі, нажніцы.

Этапы вырабу:

1. Бяром прамавугольны абрэзак з белай тканіны, складаем папалам і шчыльна скручваем у скатку.

2. Перавязваем скрутку пасярэдзіне ніткай.

3. Абазначаем галаву ніткай, захоўваючы прапорцыі, затым завязваем на галаву трохвугольны абрэзак-хустку.

4. Атрыманую ляльку пелянаем абрэзкам з каляровай тканіны і перавязваем тонкай тасмой.

Лялька “Пелянашка” гатова (Дадатак Д).

**3.7 Параўнанне традыцыйнай народнай лялькі з сучаснай лялькай**

У старажытнасці да звычайнай самаробнай лялькі адносіліся вельмі сур’ёзна. У кожнай было сваё імя, свае абавязкі. Лялькі аберагалі дзяцей, ачаг і мір у доме, ад суроку, прыцягвалі поспех і добры ўраджай.

Лялькі, якія зараз стаяць на паліцах у магазінах, значна адрозніваюцца ад тых, з якімі гулялі нашы матулі і бабулі. Даследуючы свет сучаснай лялькі, можна сказаць, што на сённяшні дзень існуе вялікая колькасць самых разнастайных лялек.

Мабыць, самай любімай лялькай з’яўляецца Барбі. Яна стала марай і ідэалам кожнай дзяўчынкі. Але гэта лялька існуе толькі ў акружэнні ўласных рэчаў. Для яе неабходна набываць мэблю, дом, аўтамабіль, сябра Кена і так бясконца.

Нягледзячы на папулярнасць лялькі Барбі, з’яўляюцца новыя, напрыклад, Братц. У адрозненне ад Барбі ў знешнім выглядзе гэтай лялькі няма нічога ад прынцэсы: джынсы, скураныя курткі, рамяні, сонечныя акуляры. Ды і фігурай

яна рэзка адрозніваецца ад Барбі – нізкарослая, з вялікай галавой. Але лялькі Братц заваявалі сваю папулярнасць, дзякуючы свайму непрадказуемаму характару,яркаму макіяжу, вялікім вачам і разнастайным калекцыям. Гэта лялька можа быць і мадэллю, і спявачкай.

На змену Братц прыйшлі лялькі Моксі. Іх знешнасць стала больш спакойнай. Разам з імі можна ператварыцца і ў цырульніка-стыліста, і ў рок-зорку.

Яркія, маляўнічыя лялькі Вінкс вучаць дабрыні, дружалюбнай гульні.

Такія лялькі, як Бэбі Бон, Бэбі Анібэль зусім як сапраўдныя немаўля могуць пазяхаць, плакаць, піць з бутэлечкі, чуць рухі і ад гучных гукаў прачынацца. Іх можна карміць спецыяльнымі кашамі, і яны могуць хадзіць на гаршчок.

Зараз ёсць дзіўныя лялькі, якія адрозніваюць сваю “маму” па голасе, у яе слоўнікавым запасе каля 680 фраз. Гэта лялька Разумніца Алёнка.

Нашы бабулі нават уявіць не маглі, што іх тканевыя лялькі з часам ператворацца ў такіх лялек-робатаў, якія будуць выпускацца масава.

Параўнаўшы традыцыйную народную ляльку з сучаснай, можна адзначыць, што як у традыцыйнай, так і ў сучаснай лялькі ёсць свае перавагі і свае недахопы. Але ёсць ў іх і агульнае: усе гэтыя лялькі ствараліся для гульні.

### 3.8 Тэхналогія вырабу тканевай народнай лялькі

Матэрыялы: кавалак тканіны белага колеру, рознакаляровыя абрэзкі тканіны, вата, ленты, тасма і іншыя ўпрыгожанні.

Возьмем кавалачак белай тканіны і складзём яго папалам. Затым сшыем з адваротнага боку і вывернем тканіну на добры бок.

Возьмем вату і шчыльна напіхаем загатоўку-тулава. Сшыем ніз. У нас атрымалася тулава.

Возьмем тоўстую нітку і туга перавяжам верхнюю частку тулава.

Атрымалася галава. Мы зрабілі загатоўку тулава.

Возьмем абрэзак тканіны, скруцім яго ў скатку і завяжам на канцах. Гэта будуць рукі. Прывяжам рукі да тулава такой жа ніткай крыж-накрыж.

Ляльку можна апрануць у рознае адзенне.

Яшчэ для ляльκі можна зрабіць валасы.

Лялька гатова [5].

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У выніку праведзенай работы я пазнаёмілася з гісторыяй узнікнення традыцыйнай народнай лялькі, класіфікацыяй народных лялек па прызначэнні і з тэхналогіяй іх вырабу, правяла сацыялагічнае апытванне, наведала раённы Цэнтр народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, школьны лялечны тэатр, наведала майстра вырабу тканевай лялькі Гоман Алену Вячаславаўну, наведалі вёску Дражня, дзе пазнаёміліся з гісторыяй лялькі 50-х гадоў мінулага стагоддзя,параўнала народную ляльку з сучаснай лялькай.

У выніку апытвання я зразумела, што маім равеснікам падабаецца вырабляць цацкі і гуляць з імі. Я думаю, што калі б яны самі вырабілі такіх лялек, у якія ўклалі б свае старанні і душу, то яны сталі б для іх сапраўднай любімай цацкай.

Нягледзячы на тое, што ва ўсім свеце добра наладжана прамысловая вытворчасць цацак, з кожным годам расце цікавасць да лялек ручной работы. Гэта пацвярджае выдзвінутую мною гіпотэзу: на традыцыйную народную ляльку не ўплывае час, і яна па-ранейшаму знаходзіць свой шлях да сэрцаў дзяцей. Лялькі з мінулага будуць актуальныя заўсёды.

Лялька можа расказаць пра традыцыі і культуру нашага народа. Традыцыйныя народныя лялькі напамінаюць нам пра нашу багатую гісторыю, звязваюць нас з нашымі продкамі. Нездарма гавораць: “Толькі тая краіна, у якой памятаюць пра сваё мінулае, варта будучыні”.

Вынікам майго даследавання сталі лялькі-абярэгі, абрадавыя, гульнёвыя і тэатральныя лялькі, зробленыя сваімі рукамі.

Я навучылася на прыкладзе маці і бабулі ствараць тканевыя лялькі і зразумела, наколькі важныя на працягу ўсяго жыцця традыцыйныя народныя лялькі.

У ходзе свайго даследавання я навучылася працаваць з літаратурнымі крыніцамі, збіраць інфармацыю, аналізіраваць атрыманыя дадзеныя і зразумела, якое вялікае значэнне мела народная лялька ў жыцці маіх продкаў. Я

навучылася рабіць ляльку-абярэг і вельмі палюбіла яе. Я думаю, што гэта стане маім захапленнем і я буду ўдасканальваць сваё майстэрства.

Лялькі не толькі цацкі, але і блізкія сябры. У гульнях з лялькамі дзеці вучацца зносінам з іншымі, фантазіраваць, тварыць, праяўляць міласэрнасць, трэніраваць памяць. Але галоўнае ў гэтых гульнях – эмацыянальны кантакт з лялькай. Дзеці не проста прывыкаюць да лялькі – яны прывязваюцца да іх, як да жывых істот і балюча развітваюцца з імі. Не трэба выкідваць старую ляльку, лепш яе памыць, пашыць новае адзенне. Усе гэтыя дзеянні – урокі чуласці, беражлівасці, увагі, дабрыні, яны выпрацоўваюць добры густ.

Лялькі суправаджаюць нас усё жыццё. У дзяцінстве гэта цацка, наведванне лялечных спектакляў. Яны забаўляюць, павучаюць, выхоўваюць, упрыгожваюць дом, служаць аб’ектам калекцыяніравання, добрым падарункам.

Лялька не нараджаецца сама: яе стварае чалавек. Яна набывае жыццё пры дапамозе ўяўлення і волі свайго стваральніка. З’яўляючыся часткай культуры ўсяго чалавецтва, лялька захоўвае ў сваім вобразе самабытнасць і характэрныя рысы народа, які стварае яе. У гэтым галоўная каштоўнасць традыцыйнай народнай тканевай лялькі.

Матэрыял майго даследавання і калекцыю тканевых лялек, зробленых мною і падараваных майстрамі, з якімі мы сустракаліся, можна выкарыстаць на выставе лялек у школьным этнаграфічным музеі “Спадчына”, на ўроках літаратуры і працы, пры правядзенні класных гадзін і віктарын. Я раю ўсім дзяўчынкам паспрабаваць зрабіць традыцыйную народную тканевую ляльку сваімі рукамі.

Цікавасць да фальклорнага мастацтва расце, а гэта значыць, што тэма майго праекта актуальна.

## ЛІТАРАТУРА

1. Дайн Галина и Мария. Русская тряпичная кукла. Культура, традиции, технология. М., Культура, традиции, технология, 2007.

2.Еникова, Л.Г. Народная кукла. Воспитание учащихся на основе традиций белоруского народа. Выхаванне і адукацыя, №3. –Мінск,2013.

3.Макаревич, И.В. Волшебство славянских кукол. Ксюша №5, 2009. – 68 - 69с.

4.Макаревич, И.В. Славянская обрядовая кукла. Ксюша №7, 2009. – 62-63с.

5.Народная культура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2002.

6.Старостина, М.В. Изготовление тряпичной народной куклы. Выхаванне і адукацыя №7, 2012. с.18 – 21.

7. Судник, М.Р. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Мінск. “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі, 2002.

8. Церашковіч, Т.А. Лялька беларуская. – Мінск: Полымя, 1992. – 3-5 с.

Інтэрнэт-рэсурсы:

Рэжым доступу: http:/www.rukukla.ru – Дата доступу: 20.12.2016

ДАДАТАК А

**Лялька ў нашай сям’і**













ДАДАТАК Б

**Наведванне раённага Цэнтра рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва г. Асіповічы**

**Лялькі Прасаловіч Валянціны Васільеўны**













ДАДАТАК В

## Сустрэча з цікавымі людзьмі

## Лялькі Гоман Алены Вячаславаўны







## Наведванне школьнага лялечнага тэатра







ДАДАТАК Д

**Наведванне вёскі Дражня Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці**

**Гульнёвая лялька канца 50х гадоў мінулага стагоддзя**



**Майстар-клас па вырабе гульнёвай лялькі “Пелянашка”**














